**LEVER**
**Культурніцкія валанцёрскія ініцыятывы як стымул развіцця мясцовых супольнасцеў у маланаселеных рэгіёнах**

**Беларуская рэспубліканская грамадская арганізацыя «Аб’яднаны шлях»**
www.ngo.by
uwb@ngo.by

## Справаздача аб рэалізацыі праекту

Праект “Культурніцкія валанцёрскія ініцыятывы як стымул развіцця мясцовых супольнасцеў у маланаселеных рэгіёнах” пачаўся з вывучэння таго, якія ёсць шляхі рашэння праблемы міграцыі жыхароў маланаселеных месцаў і ці можна згладзіць гэту праблему праз адкрыццё магчымасцей адрадзіць народныя промыслы, удзельнічаць у культурных і адукацыйных мерапрыемствах, развіваць турызм.

Эксперты Арганізацыі правялі міні-даследванне аграрнага сектару і выдзелілі некалькі найбольш сур’ёзных праблем – ад эканамічных і структурных да дэмаграфічных, сацыяльных і культурных. На базе вынікаў даследвання нам і прышлось вырашаць, якая дзейнасць можа быць падтрымана жыхарамі выбраных раёнаў.

Сацыяльна-эканамічная ацэнка перадумоў праекту і рысы, характэрныя для тэрыторый, дзе праводзіўся аналіз (перавага жаночага насельніцтва, недастатковыя магчымасці працаўладкавання, невялікая доля народных умельцаў сярод вяскоўцаў, неабходнасць рэінтэграцыі ў сеткі эканамічных, сацыяльных і культурных зносін, якія забяспечылі б годнае жыццё і развіццё), дала магчымасць гаварыць пра стварэнне ініцыятыўных груп на базе мясцовага самакіравання, якія, пры ўмове падтрымкі звонку, маглі б рэалізаваць шэраг праграм, у прыватнасці:

1. Дом. Стварэнне аўтэнтычнага сялянскага двара пачатку прошлага стагоддзя, правядзенне экскурсій, дэманстрацыя традыцыйных навыкаў і тэхналогій, навучанне.
2. Расліны. Праграма па збору раслін, вывучэнне іх выкарыстання ў традыцыйнай кухні і медыцыне. Рэканструкцыя старажытнай лякарні (без права лячыць).
3. Карані. Гісторыі пра вёскі, сем’і і людзей.

Задума ж у тым, што ўдзельнікамі і выканаўцамі ўсіх праграм будуць мясцовыя жыхары, а карыстальнікамі – турысты (пачынаючы з мясцовага турызму). Зацікаўленыя асобы будуць кансультантамі і памочнікамі.

На першапачатковай ступені намаганні Арганізацыі былі накіраваны на:

- Абмеркаванне ролі культуры ў захаванні традыцыйных культурнных каштоўнасцей беларускага грамадства
- Анализ актуальных праблем узаемадзейнасці і ўзаемнага ўплыву традыцыйных культурных каштоўнасцей
- Вывучэне метадаў папулярызацыі і захавання культурных каштоўнасцей
- Далучэнне арганізацый і асоб, якія дзейнічаюць у галіне культуры
- Прыцягненне ўвагі грамадства да запатрабаванасці, шматграннасці і ўнікальнасці беларускіх традыцыйных культурных каштоўнасцей

Было ясна, што вырашэнне такіх няпростых задач патрабуе ўдзелу зацікаўленых мясцовых арганізацый і актывістаў. Патрэбны працаўнікі музеяў, бібліятэк, дзеячы культуры, спецыялісты, якія ўжо займаюцца аналагічнымі праблемамі.

Што дапамагло:

1) Існаванне партнёрскіх зносін з Інстытутам Культуры Беларусі (ІКБ). Гэта дзяржаўная ўстанова, якая на працягу дзесяцігоддзяў займалася рознымі аспектамі культурніцкай дзейнасці. Яна аказвае паслугі па павышэнню кваліфікацыі працаўнікоў культурных установ (музеяў, бібліятэк, фальклорных груп, груп народных майстроў і інш.), якія дзейнічаюць на тэрыторыі ўсёй краіны. (Пазней ІКБ зліўся з Цэнтрам нацыянальных культур).
2) Стварэнне сеткі “базавых пунктаў ” – арганізацый (грамадскіх і дзяржаўных), якія працуюць у галіне культуры. Дзейнасць такіх базавых пунктаў дае ім магчымасць добра вывучыць стан маланаселеных рэгіёнаў, усталяваць непасрэдныя кантакты з мясцовымі органамі кіравання і актывістамі, ведаць патрэбы сялян. Гэтыя базавыя пункты могуць забяспечыць цеснае ўзаемадзеянне з зацікаўленымі асобамі, лепшую каардынацыю, ахапіць большую тэрыторыю, працаваць больш эфектыўна.

Не ўсе базавыя пункты мелі аднолькавую ролю ў праекце. Некаторыя з іх працавалі як базы ведаў і забяспечвалі інфармацыях аб магчымасці развіцця народных рамёслаў, існаванні майстроў, якія маглі б падзяліцца сваімі ведамі; іншыя былі прыкладамі і павінны былі дзяліцца вопытам, метадамі, даваць кансультацыі. Некаторыя базавыя пункты, якія на пачатку праекту былі вельмі актыўнымі, пазней сталі толькі пасіўнымі назіральнікамі (але, нягледзячы на гэта, вывучэнне вопыту паспяховых базавых пунктаў было для іх карысным).

Паездкі ў выбраную мясцовасць і правядзенне там трэнінгаў для мясцовых актывістаў было вельмі карысным у сэнсе разумення стану мясцовых супольнасцяў, магчымасці прыцягнення мясцовага бізнесу (аграсядзібы), магчымасці аб’яднаць сялян і зацікавіць моладзь.

Акрамя гэтага былі арганізаваны трэнінгі для базавых пунктаў і ініцыятыў (якія павінны былі дзейнічаць як каталізатары) для падрыхтоўкі спецыялістаў, якія б ведалі пытанні аховы культурнай спадчыны і маглі спрыяць вырашэнню гэтых праблем у сучасных культурна-сацыяльных абставінах. На трэнінгах таксама разглядаліся метады і падыходы да вырашэння шэрага пытанняў, распрацоўваліся канкрэтныя меры.

Наведванні базавых пунктаў, сувязь з імі і з зацікаўленымі асобамі дапамаглі сфармуляваць галоўныя мэты пілотных праектаў:
1) адраджэнне такога віду народнай творчасці, як вышыванне па народных матывах; і 2) збор раслін і ягад і прыгатаванне з іх гарбаты, а таксама вывучэнне выкарыстання раслін у традыцыйнай беларускай кухні. Для гэтага пілотнага праекту патрабавалася юрыдычная падтрымка і абмен вопытам. З гэтай мэтай была арганізавана навучальная паездка ў Белавежскую пушчу, якая аказалася вельмі карыснай для ўсіх – арганізатараў, валанцёраў і выканаўцаў праекту.

К наступнаму часу рэалізаваны два пілотныя праекты:

1) Адраджэнне такога віду народнай творчасці, як вышыванне па народных матывах (рушнікі, сурвэткі, абрусы, і інш.)

Навучанне «роўны – роўнаму» і перадача навыкаў спрацавалі вельмі добра. Фінальнае мерапрыемства – мясцовую выставу ў прыватным доме – наведалі мясцовыя жыхары і іх

родныя і знаёмыя з суседніх вёсак. Далей такая выстава можа трансфармавацца ў мабільную выставу і дэманстравацца ў суседніх вёсках раёну.

2) Збор раслін і ягад і прыгатаванне гарбаты, а таксама вывучэнне выкарыстання раслін у традыцыйнай беларускай кухні

Першапачатковая мэта прадаваць травяную-ягадную гарбату (для чаго неабходна атрымаць ліцэнзію) пераўтварылася ў мэту перадачы ведаў пра расліны, спосабы іх збору і падрыхтоўкі, прыгатавання травяных сумесяў для гарбаты і г.д. Праект працуе ў форме майстар-класаў, якія вядуць мясцовыя збіральнікі раслін.

Таксама неабходна было забяспечыць устойлівасць праектаў. Каб зацікаўленыя асобы разумелі перспектывы развіцця праектаў і магчымасці атрымання прыбытку з цягам часу, іх запрашалі на трэнінгі і майстар-класы. Удзел мясцовых актывістаў, цікавасць з боку мясцовай адміністрацыі і мясцовага бізнесу (аграсядзібы), адпаведнасць дзяржаўнай праграме развіцця сельскіх рэгіёнаў даюць падставы гаварыць пра ўстойлівасць праектаў.

На працягу ўсяго часу рэалізацыі Арганізацыя займалася распаўсюджваннем інфармацыі аб праекце. Базавыя пункты атрымлівалі інфармацыю аб ходзе рэалізацыі па электроннай пошце, скайпу, у час наведванняў ці на мерапрыемствах, арганізаваных для ацэнкі эфектыўнасці і ролі базавых пунктаў, праз абмен інфармацыяй, пры выпрацоўке шляхоў забеспячэння ўстойлівасці пілотных праектаў.

Акрамя базавых пунктаў інфармацыя распаўсюджвалася праз партал і сацыяльныя сеткі Арганізацыі. Падрыхтоўваліся матэрыялы для распаўсюджвання на мерапрыемствах, якія праводзіла Арганізацыя і іншыя грамадскія аб’яднанні, Мінскі міжнародны адукацыйны цэнтр, Цэнтр нацыянальных культур (новы партнёр Арганізацыі), а таксама на міжнарожным узроўні – на XX Фестывалі мастацтва людзей з абмежаванымі магчымасцямі, арганізаваным Цэнтрам сацыяльнай дапамогі (DPS No 5) Лодзі (Польшча).